*УДК 821.161.3(092 Я. Колас)*

# ТРАДЫЦЫІ БЕЛАРУСКАГА ФАЛЬКЛОРУ Ў ТВОРЧАСЦІ ЯКУБА КОЛАСА

**Т. У. Ганчарова-Цынкевіч**

*Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка*
*Мінск, Рэспубліка Беларусь*
*wowancc@mail.ru*

У артыкуле пададзены кароткі аналіз творчасці Якуба Коласа ў святле народна-песенных традыцый нацыянальнага фальклору.

*Ключавыя словы:* Якуб Колас; фальклор; творчасць; паэзія; лірыка; мастацкія вобразы; казкі; песні; прыказкі; прымаўкі; легенды; паданні.

# TRADITIONS OF BELARUSIAN FOLKLORE IN CREATIVITY YAKUB KOLAS

**T. U. Hancharova-Tsinkevich**

*Belarusian State Pedagogical University named after Maxim Tank*
*Minsk, Republic of Belarus*
*wowancc@mail.ru*

The article provides a brief analysis of the work of Yakub Kolas in the light of folk song traditions of national folklore.

*Key words:* Yakub Kolas; folklore; creativity; poetry; lyrics; artistic images; fairy tales; songs; proverbs; proverbs; legends; submissions.

Народна-паэтычная творчасць адыграла вялікую ролю ў развіцці мастацкага густу і таленту Якуба Коласа, з'явілася першай крыніцай натхнення, аб чым неаднаразова гаварыў сам пісьменнік. Народныя казкі, песні, паданні, легенды, прымаўкі і прыказкі зрабілі вялікі ўплыў на яго светапогляд і літаратурную дзейнасць. І гэту школу народнай мудрасці Якуб Колас прайшоў ад калыханкі маці, ад песень жней, пачутых у дзяцінстве на палетках, ад казак і паданняў, расказаных на начлезе, на рыбалцы, ад паэтычных небыліц палешукоў, падслуханых на стракатых кірмашах, на ціхіх беларускіх шляхах і прасёлках − гэта той невычарпальны клад мудрага слова, які паэт засвоіў і зрабіў неад'емным здабыткам свайго творчага майстэрства.

Зацікаўленасць Якуба Коласа да народнай паэзіі ўзрасла ў гады вучобы ў Нясвіжскай настаўніцкай семінарыі (1898–1902 гг.). Пісьменнік у сваёй аўтабіяграфіі згадваў, што падчас канікул запісаў шмат казак, легенд, паданняў, песень, загадак, прыказак і прымавак. Некаторыя з гэтых запісаў пазней былі выкарыстаны мастаком слова ў яго творах.

У першыя гады сваёй настаўніцкай працы на Палессі Якуб Колас таксама цікавіўся беларускімі этнаграфічнымі і фальклорнымі зборнікамі. І нават сам прыступіў да напісання фальклорна-этнаграфічных работ. Сярод іх найбольш вядомыя − «Наша сяло, людзі і што робіцца ў сяле», «Аб сялянскіх будоўлях вёскі Люсіна Мінскай губерні Пінскага павета Хатыніцкай воласці». У першай з іх пісьменнік спыняецца на характарыстыцы індывідуальных асаблівасцей народных казачнікаў, што пацвярджае яго добрае знаёмства з метадамі тагачаснай фалькларыстыкі. Матэрыялы другой работы ён пазней скарыстае ў трылогіі «На ростанях», малюючы жыццё вёскі Цельшына.

Якуб Колас з самага пачатку мастацкай дзейнасці падкрэсліваў блізкасць да творчасці народа нават у назвах сваіх зборнікаў паэзіі і прозы («Песні-жальбы», «Казкі жыцця»), у назвах асобных твораў («Дудка»), дзе прысутнічае вобраз дудкі, песняра («Пясняр», «Песняру»),

згадваюцца песні, песні-скаргі, песні-казкі («Не пытайце, не прасеце», «Песні вясны», «Песні няволі», «Наш родны край», «Ворагам», «Родныя песні», «Мужык», «З песень адзінокага», «Песня», «Старыя песні», «Жніўныя песні» і інш.).

Адзін з першых друкаваных вершаў Якуба Коласа «Наш родны край» (газета «Наша доля» за верасень 1906 г.) напісаны на ўзор народных песень: «Край наш бедны, край наш родны! // Лес, балоты і пясок… // Чуць дзе крыху луг прыгодны… // Хвойнік, мох ды верасок. // А туманы, як пялёнка, // Засцілаюць лес і гай. // Ой ты, бедная старонка! // Ой, забыты Богам край!» [2, с. 37]. Агульны тон верша нагадвае старадаўнія песні аб пакутах і цяжкой долі народа, таму не выпадкова ў ім згадваюцца і песня нуды, і сумная доля-нядоля. Эпітэты, выкарыстаныя ў гэтым творы, пераважна з народна-паэтычнай культуры («край наш бедны», «бедная старонка», «забыты Богам край» і інш.), параўнанні («сумны ты, як сірата», «глядзіш, як сірата», «край наш… як наша цемната») пачэрпнуты таксама з фальклору.

У вершы «Песняру» паэт заклікае мастакоў слова пісаць такія творы, якія былі б дзейснымі для народа, дапамагалі людзям перажыць цяжкую нядолю, мелі грамадзянскае гучанне: «Заспявай ты мне песню такую, // Каб душу мне паліла яна, // Каб у ёй ты нядолю людскую // І ўсё вычарпаў гора да дна… // Заспявай жа ты песню такую, // Каб маланкай жахала яна // І паліла нядолю людскую, // Каб грымела, як гнеў перуна» [1, с. 286–287].

Вобраз нядолі людской або нешчаслівай долі сустракаецца ў многіх фальклорных творах. Якуб Колас свядома карыстаецца вуснай паэзіяй, і гэта дае яму магчымасць стаць больш зразумелым і блізкім беларускаму народу. Гэты вобраз прысутнічае і ў такіх вершах паэта, як «Дарога», «Не пытайце, не прасеце», «Плытнікі», «Доля батрачкі», «Горкая доля», «Наша доля», «Пытанне».

Цяжкая доля працоўнага народа − адна з тэм паэзіі Якуба Коласа нашаніўскага перыяду. Ён паказвае жыццё сялян роднай старонкі («Мужык», «Мужычае жыццё», «Доля батрачкі», «З песень адзінокага», «Мацерына гора», «Уночы», «На адзіноце» і інш.). Гаворачы аб жыцці мужычага люду, паэт ужывае песенныя вобразы і мастацкія прыёмы. Так, у вершы «Мужык» можна знайсці фальклорныя параўнанні: «рыю зямлю, як крот», «прападаю, як мыш», «голы, як бац». У гэтым вершы падаецца ў духу народных песень і мастацкая паралель: «То не дуб у бары // Заскрыпеў, застагнаў − // Гэта я без пары // Богу душу аддаў» [2, с. 49].

Цікава, што вершы Якуба Коласа пра цяжкае жыццё беларускага сялянства, працоўных не песімістычныя. У іх, як і ў народна-паэтычных творах, гучыць упэўненасць, што хутка прыйдзе перамога і сацыяльная няроўнасць будзе пераадолена, народ зброяй заваюе сабе шчаслівую долю («Мужык», «Будзь цвёрды», «Будзе навальніца» і інш.).

Лірыка Якуба Коласа цесна звязана фальклорам не толькі па змесце, але і па сваёй паэтыцы. У ёй, як і ў тэкстах вусна-паэтычнай творчасці, часта сустракаецца прыём адухаўлення прыроды − зварот да ветру, сонца, яснай зары, хмар, рэчкі, кветак, палёў, лясоў і г. д.: вершы «Веснавыя хмаркі», «Мяцеліца», «Асенні вечар», «Нёман», «Хмары», «Мужычая ніва», «Краска», «Вячэрнія хмаркі», «Вецер», «Вярбіна», «Ручэй», «Дзе б ні быў я…». Відавочна, што гэтыя вобразы навеяны народна-паэтычнай творчасцю і з’яўляюцца вынікам уздзеяння вуснай паэзіі на літаратурнае мастацтва беларускага класіка.

Аднак трэба заўважыць, што ў сваіх лірычных вершах Якуб Колас даволі рэдка распрацоўваў песенныя тэмы. Затое большасць яго вершаваных апавяданняў амаль цалкам пабудавана на фальклорным матэрыяле − на матэрыяле народных казак, паданняў, легенд, анекдотаў. Колас, як ніхто з беларускіх пісьменнікаў, шырока карыстаўся фальклорнымі празаічнымі жанрамі, асабліва сатырычнага і гумарыстычнага характару. Гэта можна ўбачыць у такіх яго вершаваных апавяданнях, як «Доктар памог», «За дождж», «Зяць», «Паслушная жонка», «Батрак», «Як Янка забагацеў», «Паўлюкова бяда», «Пад новы год» і інш. Менавіта гэтыя апавяданні найбольш пераклікаюцца з фальклорнымі традыцыямі.

У аснову вершаваных апавяданняў «Зяць» і «Паслушная жонка» пакладзены сюжэты сатырычных і гумарыстычных народных казак бытавога характару. У першым з іх высмейваецца злая цешча, а ў другім − непаслухмяная жонка. У гэтыя творы ў адпаведнасці з фальклорнымі крыніцамі ўведзены асноўныя казачныя эпізоды і характэрныя апісанні. Таксама пісьменнік

выкарыстоўвае і некаторыя песенныя элементы («Паслушная жонка») – параўнанні тыпу «дзяўчына – чараўніца», «Таня – гожая былінка», пастаянныя эпітэты «тонкі стан», «ясны дзень» і г. д.

Апавяданні «Доктар памог» і «Паўлюкова бяда» нагадваюць гумарыстычныя народныя казкі бытавога характару. У першым высмейваецца шарлатанства і хабарніцтва фельчараў, а ў другім – п'янства. Смех гэтых твораў выкрывальны і з'едлівы, накіраваны на знішчэнне цёмных праяў вясковага жыцця. Вершаванае апавяданне «Ігрышча», у якое па-майстэрску ўключаны іскрыстыя танцавальныя народныя песні, апрацаваныя Якубам Коласам, заклікае адмовіцца ад забабонаў і вясковай цемры, невуцтва.

Большасць твораў мастака слова, напісаных у нашаніўскі перыяд і 1920-я гг., носіць бытавы характар. Толькі тры з іх – «Як Янка забагацеў», «Батрак», «Пад Новы год» – вызначаюцца сацыяльнай тэматыкай. Аднак і ў іх аўтарам шырока выкарыстаны фальклорны матэрыял. Сярод гэтых апавяданняў найбольш вострым з'яўляецца «Як Янка забагацеў», у аснову якога пакладзена народная легенда аб дапамозе святога бедняку. Гэта легенда распрацавана паэтам даволі арыгінальна – у анекдатычнай форме. Такі падыход да фальклорнага матэрыялу абумоўлены аўтарскай задумай і ідэйным зместам твора.

Народныя паданні і легенды выкарыстаны Якубам Коласам і ў празаічных апавяданнях «Трывога», «Чорт», «На начлезе». У іх пісьменнік спрабуе асэнсаваць прычыны, што параджаюць у забабонных людзей веру ў нячысцікаў.

У сваіх сатырычных і гумарыстычных творах Якуб Колас часта карыстаўся народным трапным словам, прыказкамі і прымаўкамі, на іх узор складаў і свае афарызмы. Напрыклад, «крыкі спрэчкі не развяжуць» («Паслушная жонка»), «дзень вяселля назначылі, ды вяселля не бачылі» («Батрак») і інш.

Шэраг алегарычных апавяданняў, якія пазней склалі зборнік «Казкі жыцця», таксама звязаны з фальклорам. Так, у апавяданні «Жывая вада» алегарычна-казачны вобраз жывой вады і праклятай гары сімвалізуе сутыкненне сіл народа з царызмам за сваю незалежнасць. У апавяданнях «Залаты прамень» і «На ўсё ёсць прычына» ў вобразах старога лесуна і гнілога дуба паказана аджыўшае свой век самаўладдзе.

Класічныя паэмы «Новая зямля» і «Сымон-музыка» напоўнены духоўнай скарбніцай вуснай народнай паэзіі. Так, «Новая зямля» прасякнута фальклорам – песнямі, прыказкамі і прымаўкамі. Народныя песні з'яўляюцца адным з важнейшых элементаў мастацкай формы паэмы. У яе арганічна ўключаны аўтарам (у апрацоўцы) шматлікія песні і песенныя ўрыўкі, якія дапаўняюць і ўпрыгожваюць задуму паэта. Каб падкрэсліць цяжкое жыццё сялянства, Якуб Колас выкарыстоўвае такія песні, як «Я найму дудара», «І гэта наша жыццё злое», «У полі, полі» і інш.: «У полі, полі // Пры дарожачцы // Прыхіліўся крыж // Над магілаю. // Беглі сцежачкі // Ў свет шырокенькі, // Прывялі ж яны // К той магіланцы!..» [2, с. 536]. Песня глыбока лірычная і пранікнёная.

Асабліва часта ў «Новай зямлі» пісьменнік скарыстоўвае народныя прыказкі і прымаўкі, параўнанні. Яны не толькі надаюць выразнасць стылістычнаму гучанню паэмы, але і садзейнічаюць больш глыбокаму раскрыццю ідэі і зместу твора. Для прыкладу можна згадаць: «Як той шчупак, папаўшы ў нерат, не знае ён: дзе зад, дзе перад», «Наняўся, кажуць, як прадаўся», «Або ты знойдзеш праўду ў свеце?», «Ды хоць бы пан, а то зараза», «Сядзіць, як воўк той», «А вочы тыя, як у змея», «Як студзень, карк яго трасецца» і інш. Якуб Колас з дапамогай многіх фальклорных прымавак, параўнанняў ярка характарызуе сялянскі побыт, гаспадарчы вопыт, кемлівасць беларуса-мужыка.

Цесна звязана з народна-паэтычнай творчасцю і паэма «Сымон-музыка», якая гучыць як цудоўная казка-песня. Ужо само дзеянне паэмы разгортваецца на фоне народных песень, суправаджаецца байкамі-казкамі, легендамі, якія маюць глыбокі алегарычны сэнс. Паэма нібыта саткана з фальклорных песенных матываў: «Ад роднае зямлі, ад гоману бароў, // Ад казак вечароў, // Ад песень дудароў… // Ад шолаху начэй, // Ад тысячы ніцей, // З якіх аснована і выткана жыццё // І злучана быццё і небыццё, – // Збіраўся скарб, струменіўся няспынна, // Вясёлкавым ірдзеннем мне спяваў» [2, с. 537].

Паэмы «Новая зямля» і «Сымон-музыка» Якуб Колас заканчваў пісаць у савецкі час, у 1920-я гг., і гэта было сведчаннем таго, што і ў новых умовах паэт не аслабіў сваёй увагі да невычарпальных крыніц вуснай народнай паэзіі.

Творчасць Якуба Коласа ўсебакова звязана з фальклорам. Класік нашай нацыянальнай літаратуры шчодра чэрпаў са скарбніц мудрасці свайго народа, што з'явілася павучальным прыкладам, мастацкай школай для многіх беларускіх паэтаў і празаікаў.

**Бібліяграфічны спіс**

1. Беларуская літаратура / склад. У. Адамчык, М. Адамчык. − Мінск: Сучасны літаратар, 2004. − 1008 с.
2. Колас, Я. Паэмы. Апавяданні. Аповесці. Трылогія «На ростанях» / Я. Колас; прадм. М. Мушынскага. – Мінск: Харвест, 2012. − 1168 с.
3. Навуменка, І. Якуб Колас: духоўны воблік героя / І. Навуменка. − Мінск: Беларусь, 1968. − 336 с.

*УДК 821.161.3(092 Я. Купала, М. Багдановіч)*

## ЯНКА КУПАЛА, МАКСІМ БАГДАНОВІЧ І ПРАЦЭС КУЛЬТУРАТВОРЧАЙ МАДЭРНІЗАЦЫІ Ў БЕЛАРУСКАЙ ПАЭЗІІ

**С. В. Грымута**

*Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы*
*Гродна, Рэспубліка Беларусь*
*relish5@rambler.ru*

У артыкуле аналізуецца роля нацыянальных класікаў Янкі Купалы і Максіма Багдановіча ў працэсе мастацка-эстэтычнага абнаўлення і ўзбагачэння беларускай паэзіі. Праведзены тыпалагічныя паралелі, вылучана агульнае і адрознае ў творчых канцэпцыях абодвух паэтаў.

*Ключавыя словы:* Янка Купала; Максім Багдановіч; тыпалогія творчасці; мадэрнізацыя; санет.

## YANKA KUPALA, MAXIM BAGDANOVICH AND THE PROCESS OF CULTURAL MODERNIZATION IN BELARUSIAN POETRY

**S. V. Grymuta**

*Yanka Kupala State University of Grodno*
*Grodno, Republic of Belarus*
*relish5@rambler.ru*

The article analyzes the role of the national classics Yanka Kupala and Maxim Bagdanovich in the process of artistic and aesthetic renewal and enrichment of Belarusian poetry. Typological parallels are drawn, common and distinctive in the creative concepts of both poets are highlighted.

*Key words:* Yanka Kupala; Maxim Bagdanovich; typology of creativity, modernization; sonnet.

Дынаміка жыцця пачатку XX стагоддзя паставіла перад беларускімі творцамі новыя задачы, для вырашэння якіх было неабходным асэнсаванне гістарычнага вопыту і выпрацоўка-пастуляванне кірункаў далейшага развіцця айчыннага мастацтва слова. Арыгінальны мастацкі вопыт Янкі Купалы і Максіма Багдановіча на шляху мадэрнізацыі нацыянальнага пісьменства быў плённым і ў многім сугучным аналагічным працэсам у літаратурах суседніх краін.